

Zajęcia dla dzieci i młodzieży w Warszawie – język białoruski

# Заняткі для дзяцей і моладзі ў Варшаве

У Польшчы кожнае дзіця мае права на бясплатную адукацыю. Таксама ёсць мноства пазашкольных заняткаў, дзе дзеці могуць развіваць свае інтарэсы, культурная прапанова, арыентаваная на самых маленькіх і не толькі.

## Пазашкольныя заняткі

У Варшаве працуе мноства мастацкіх цэнраў, моладзевых Дамоў культуры, іярданаўскіх садоў і цэнтраў культурнай адукацыі, дзе дзеці і моладзь могуць развіваць свае інтарэсы, таленты і хобі.
Гэтыя ўстановы прапануюць заняткі:

- **мастацкія** - тэатральныя, спевы, ігра на інструменце, жывапіс, скульптура і г. д.,
- **спартыўныя** – мастацкая гімнастыка, дзюдо, плаванне, камандныя гульні і г. д.,
- **навуковыя** – замежныя мовы, праграміраванне, кампутарная графіка і г. д.

Заняткі звычайна бясплатныя - як правіла, патрабуецца невялікая плата ў бацькоўскі савет. Часам бярэцца дадатковая плата, аднак заўсёды ніжэй камерцыйных ставак.

## Як запісаць дзіця на такія заняткі?

1) **У адпаведнасці з графікам набору.** Кожны год у пачатку траўня запускаецца онлайн-набор праз гарадскую сістэму, якая таксама выкарыстоўваецца для рэгістрацыі ў дзіцячыя садкі і пачатковыя школы. Трэба зайсці на сайт warszawa-pozaszkolne.pzo.edu.pl і падаць нумар сацыяльнага забеспячэння PESEL дзіцяці і пароль, згенерыраваны дырэктарам установы.
2) **У рамках дадатковага набору.** У другой палове жніўня зноў магчымы набор на сайце warszawa-pozaszkolne.pzo.edu.pl – тады можна запісаць дзіця, калі пасля першага туру запісаў засталіся вольныя месцы.
3) **У рамках бесперапыннага набору.** Кожны з бацькоў можа таксама звярнуцца ў дом культуры або іншую ўстанову, якая ажыццяўляе пазашкольныя заняткі, і даведацца аб наяўнасці месцаў. Дзіця можа далучыцца ў любы час навучальнага года - інфармацыю аб магчымасцях запісу можна знайсці на сайце warszawa-pozaszkolne.pzo.edu.pl на ўкладцы „Вольныя месцы" („Wolne miejsca").

## Установы, якія прапануюць пазашкольныя заняткі:

**Бяляны (Bielany)**

- Бялянскі цэнтр культурнай адукацыі, centrumszegedynska9a.pl
- Моладзевы дом культуры „Бяляны", mdkbielany.pl
- Моладзевы дом культуры ім. Марыі Гвіздак, mdkandersena.edupage.org

**Макотаў (Mokotów)**

- Моладзевы дом культуры „Макотаў", mdk-mokotow.pl
- Цэнтр пазашкольнай працы „175", ognisko175.edu.pl
- Цэнтр пазашкольнай працы „70", opp70.pl

**Ахота (Ochota)**

- III Ірданаўскі сад, ogrodjordanowski3.szkolnastrona.pl
- Міжшкольны спартыўны цэнтр №7, mosochota.waw.pl
- Моладзевы дом культуры «Ахота», mdkochota.edu.pl
- Цэнтр пазашкольнай працы, oppochota.superszkolna.pl (także lekcje języka polskiego dla cudzoziemców)

**Прага-Палудне (Praga-Południe)**

- Міжшкольны спартыўны цэнтр №2, mos2.pl
- Цэнтр пазашкольнай працы №1 "Ірданак", opp1.waw.pl
- Цэнтр пазашкольнай працы №2 ім. др. Хенрыка Ірдана, opp2.waw.pl
- Цэнтр пазашкольнай працы №3, opp3.waw.pl
- Цэнтр пазашкольнай працы №4, opp4.waw.pl

**Прага-Пулнац (Praga-Północ)**

- VII Ірданаўскі сад, oj7.edu.pl

**Шрудмешчэ (Śródmieście)**

- Міжшкольны спартыўны цэнтр №1 "Агрыкола"tiny.pl/wqjm5
- Моладзевы дом культуры ім. Владзіслава Браневскага, mdk.waw.pl
- Моладзевы дом культуры «Муранаў» ім. С.К.Норвіда, mdk-muranow.waw.pl
- Палац моладзі, pm.waw.pl
- Дзяржаўны мастацкі цэнтр "Наваліпкі", nowolipki.edu.pl
  Сталічны цэнтр культурнай адукацыі ім. KEN, scek.pl

**Таргувэк (Targówek)**

- VIII Ірданаўскі сад, oj8targowek.eduwarszawa.pl

**Воля (Wola)**

- Міжшкольны спартыўны цэнтр №6, moswola.pl
- Моладзевы дом культуры, mdk.zwpek.pl
- V Ірданаўскі сад, voj.zwpek.pl

**Жалібаж (Żoliborz)**

- Цэнтр пазашкольнай працы "Жалібаж", oppzoliborz.waw.pl

## Дамы культуры

Моладзевыя Дамы культуры, цэнтры і іярданаўскія сады працуюць у рамках сталічнай сістэмы адукацыі, і іх прапанова адрасаваная выключна дзецям і моладзі, у той час як раённыя дамы культуры маюць шырокую прапанову таксама для дарослых і пажылых людзей. Часта гэта сучасныя ўстановы, дзе можна вывучаць замежныя мовы (а таксама польскую мову!), займацца гарадскім садоўніцтвам, вучыцца працаваць на кампутары, займацца ёгай або аэробікай ці глядзець тэатральныя спектаклі. Удзел у занятках часта ўключае ў сябе невялікую плату, але ёсць таксама бясплатная прапанова. Поўную інфармацыю аб варшаўскіх дамах культуры вы знойдзеце на сайце nadajemykulture.pl.

## Месцы лакальнай актыўнасці

У Варшаве дзейнічаюць больш за 100 месцаў лакальнай актыўнасці (MAL). Яны кіруюцца няўрадавымі арганізацыямі, бібліятэкамі і дамамі культуры, і іх ідэя заключаецца ў стварэнні і ўмацаванні сувязей з суседзямі і мясцовым грамадскім жыццём. У такіх месцах можна пагуляць у настольныя гульні, пачытаць кнігу або паўдзельнічаць у сумесным гатаванні ежы. Гэтыя месцы таксама адкрыты для нізавых ініцыятыў жыхароў Варшавы - калі вы хочаце падзяліцца гісторыямі аб сваёй краіне, мове і культуры, то такое месца выдатна для гэтага падыходзіць!
Тут вы знойдзеце карту такіх месцаў: um.warszawa.pl/waw/sasiedzka/lista-mal.

## Мерапрыемствы для сем'яў і дзяцей - фэстывалі, пікнікі, майстар-класы

Варта даведацца аб бясплатных мерапрыемствах, якія часта арганізуюцца раённымі адміністрацыямі або ўстановамі культуры, напрыклад музеямі. Ёсць некалькі вэб-сайтаў, якія збіраюць у адным месцы гэтыя прапановы:

- waw4free.pl/warszawa-darmowe-dzieci
- miastodzieci.pl/warszawa
- kidsinthecity.pl (сайт на англійскай мове)
- warszawa19115.pl/szukasz-informacji/kultura-turystyka-sport/wydarzenia-kulturalne (гарадскі інфармацыйны партал)

## Дадатковыя прапановы

- Адным з самых прывабных месцаў для дзяцей у Варшаве з'яўляецца Навуковы цэнтр Каперніка. Вы можаце разгледзець магчымасць залічэння дзіцяці ў клуб Каперніка (кошт: 220 зл. у год). У рамках сяброўства дзіця і дарослы (не павінны быць указаны) маюць неабмежаваны ўваход у НЦК на працягу ўсяго года.
- АКАДЭМІЯ AKS Zły - гэта заняткі па футболу для самых маленькіх, якія праводзяцца футбольным клубам, падтрымліваючым на працягу многіх гадоў мігрантаў і бежанцаў у Варшаве: akademia.aks-zly.pl.
- Цікавую прапанову для моладзі падрыхтавала INCLSV BUZZ - месца, адкрытае для маладых бежанцаў і бежанак, рэлігійных і культурных меншасцяў: facebook.com/inclusive.buzz.
- Мультыкультурны цэнтр (Centrum Wielokulturowe) - гэта месца, якое падтрымлівае інтэграцыю мігрантаў і мігрантак з жыхарамі Варшавы. Там часта праводзяцца бясплатныя мерапрыемствы для дзяцей - варта наведваць сайт centrumwielokulturowe.waw.pl/kalendarz.

---

UNIA EUROPEJSKA
FUNDUSZ AZYLU,
MIGRACJI I INTEGRACJI

POLSKIE FORUM MIGRACYJNE

*Бяспечная гавань*
*(Bezpieczna przystań)*
Праект сумесна фінансуецца Нацыянальнай праграмай Фонду прытулку, міграцыі і інтэграцыі

Fundacja Polskie Forum Migracyjne
ul. Szpitalna 5/14, Warszawa
+48 692 913 993
info@forummigracyjne.org
**www.forummigracyjne.org**

Выключная адказнасць за выказаныя думкі ляжыць на аўтары, і Еўрапейская камісія, а таксама Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі не нясуць адказнасці за тое, як выкарыстоўваецца уступленая інфармацыя.